# Адліга па лініі Мінск – Брусель -  дылема апазіцыі

На апазыцыйнай сцэне Беларусі існуе даволі вялікая колькасьць суб'ектаў. Аднак вельмі важнай, хіба не ключавой праблемай зьяўляецца ацэнка іх сапраўднай вагі. З прычыны аўтарытарнага характару беларускай ўлады і асаблівасьцяў грамадзка-палітычнай сытуацыі звычайныя, традыцыйныя крытэрыі ацэнкі ўплыву тых ці іншых грамадзка-палітычных утварэньняў у Беларусі не працуюць. Ніводная з апазыцыйных сілаў не прадстаўленая ні ў органах выканаўчай улады, ні ў парлямэнце, ні ў мясцовых Саветах, нават пры адсутнасьці колькі-небудзь сурьёных паўнамоцтваў у прадстаўнічай галіны ўлады. Вулічныя акцыі даволі малалікія, і скіраваныя адно на маніфэстацыю ўласнага палітычнага крэда, яны ня робяць значнага ўплыву на грамадзтва, на тых, хто не належыць да актыву апазыцыйных арганізацыяў.

Зьвесткі аб колькасным складзе арганізацыяў не зьяўляюцца вартымі даверу і ва ўсіх арганізацыях вар'юююцца ў межах некалькі тысячаў чалавек.

Таму даволі ўмоўным крытэрам вагі зьяўляецца прадстаўленасьць тых ці іншых арганізацыяў і палітыкаў у мэдыях і узровень іх міжнародных кантактаў. Гэта нагадвае рэфлексіўнае вызначэньне Давіда Гілбэрта „Матэматыка – гэта тое, што пад гэтым разумеюць кампэтэнтныя людзі“, іншымі словамі, вагу маюць тыя, хто мае яе з пункту гледжаньня журналістаў і замежнікаў. Яны могуць памыляцца, але іншыя крытэры наўрад ці больш адэкватныя.

З гэтага пункту гледжаньня найбольш уплывовымі палітычнымі арганізацыямі зьяўляюцца тры палітычныя партыі – Беларускі Народны Фронт (БНФ), Аб'яднаная Грамадзянская Партыя (АГП) і Партыя Камуністаў Беларуская (ПКБ). Магчыма, роўную зь імі вагу, ці крыху меншую, мае створаная нядаўна партыя, якая беспасьпяхова спрабуе зарэгістравацца – Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя (БХД), і моладзевая арганізацыя „Малады Фронт“.

Да „другой лігі“ апазыцыйных арганізацыяў можна аднесьці Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю „Грамада“(БСДП)  і Рух „За Свабоду“. Іншыя арганізацыі і кааліцыі ўяўляюцца  ў значнай ступені fake-структурамі, некаторыя зь іх маюць пэўныя магчымасьці, напрыклад, ініцыятыва „Хартыя-97“ мае адзін з самых папулярных апазыцыйных сайтаў, але наўрад ці могуць разглядацца, як уплывовыя палітычныя сілы.

Да апошняга часу найбольш уплывовыя апазыцыйныя арганізацыі – АГП, ПКБ, БНФ, Рух „За Свабоду“ ўваходзілі ў склад кааліцыі Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы (АДС).

Што тычыцца найбольш уплывовых, аўтарытэтных палітыкаў, то іх іерархія не супадае з іерархіяй арганізацыяў. Найбольш уплывовая і папулярная асоба – былы кандыдат у прэзыдэнты, лідэр Руху „За Свабоду“ Аляксандар Мілінкевіч. Ягоны канкурэнт на выбарах 2006 году Аляксандар Казулін страціў значную частку свайго уплыву, ён правёў за кратамі амаль два гады і быў вызвалены пад ціскам заходніх дзяржаваў. Аднак яшчэ да яго вызваленьня ён быў пазбаўлены пасады старшыні БСДП, пасьля вызваленьня выйшаў з шэрагаў партыі і зараз ня мае за сабой ніякай арганізацыі. Таксама да шэрагу найбольш уплывовых палітыкаў варта аднесьці старшыняў АГП Анатоля Лябедзьку і ПКБ Сяргея Калякіна. Новы кіраўнік БНФ, малады палітык Аляксей Янукевіч пакуль мае даволі вузкую вядомасьць і невялікі аўтарытэт.

Лідэр БХД Павал Севярынец і фактычны лідэр ініцыятывы „Хартыя-97“ Андрэй Саньнікаў могуць быць аднесеныя да „другой лігі“ апазыцыйнай эліты: Севярынец даволі папулярны сярод апазыцыйнай моладзі, Саньнікаў кантралюе папулярны інфармацыйны сайт і вызначаецца, як былы дыплямат, уменьнем працаваць з замежнымі партнэрамі.

**Аб’яднаныя дэмакратычныя сілы пасьля выбараў 2006 году**

Вынікі прэзыдэнцкіх выбараў 2006 году, параза спробы “каляровай” рэвалюцыі сталі пачаткам глыбокага крызісу апазыцыі. Лідэр сацыял-дэмакратычнай партыі, кандыдат на прэзыдэнта Аляксандар Казулін патрапіў за краты. У сваю чаргу лідэры партыяў, якія падтрымлівалі адзінага кандыдата ад апазыцыі Аляксандра Мілінкевіча, найперш старшыня Аб'яднанай Грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька і старшыня Партыі Камуністаў Беларускай Сяргей Калякін былі незадаволеныя сытуацыяй, калі Мілінкевіч, які прайграў выбары, займаў пасаду старшыні Палітрады Аб'яднаных дэмакратычных сілаў, заставаўся ў пэўным сэнсе іх начальнікам і тварам беларускай апазыцыі для замежжа і часткова для беларускай публікі. Тут варта ўлічыць, што падчас саміх прэзыдэнцкіх выбараў 2006 году Мілінкевіч быў чымсьці кшталту бізнэсоўца, які робіць свой бізнэс за кошт крэдытных рэсурсаў, ён ня меў за сабой уласнай палітычнай сілы.

Ягонае імкненьне стварыць уласны „Рух „За Свабоду“, абвешчанае пасьля выбараў 2006 году, ня мела вялікага плёну, нават пасьля рэгістрацыі Руху напрыканцы 2008 году (гэтая рэгістрацыя падавалася беларускай уладай як важны крок у накірунку лібэралізацыі), гэтая арганізацыя на чале з А. Мілінкевічам ня мела вялікай колькасьці сябраў і не магла

раўняцца паводле уплыву з такімі партыямі, як БНФ, АГП ці ПКБ.

У 2007 годзе з ініцыятывы А. Лябедзькі і С. Калякіна быў скліканы Кангрэс дэмакратычных сілаў, на якім пасада сталага старшыні Палітрады АДС была скасаваная, было вырашана, што яе будуць займаць па чарзе кіраўнікі арганізацыяў, што ўваходзяць у АДС. Гэты зьмена істотна зьнізіла статус Аляксандра Мілінкевіча, ён стаў усяго толькі лідэрам адной з апазыцыйных арганізацыяў, на той момант незарэгістраванай і далёка ня самай уплывовай.

Але сёлета Мілінкевіч здолеў узяць рэванш. Яго Мілінкевіча адносна новай беларускай палітыкі Эўразьвязуі  і зьмена кіраўніцтва ў БНФ, прыход да ўлады ў гэтай партыі ягоных прыхільнікаў, сталі асноўнымі фактарамі, які абумовілі стварэньне новай кааліцыі Беларускага незалежніцкага блёку (БНБ), у які ўвайшлі БНФ, Рух „За Свабоду“, БХД  і „Малады Фронт“. Мілінкевіч стаў лідэрам гэтай новай кааліцыі, якая разарвала стасункі з былымі партнэрамі па АДС.

Безумоўна, пасьля ўтварэньня новай кааліцыі на чале з самым папулярным апазыцыйным палітыкам краіны, пасьля выхаду з АДС Руху „За Свабоду“ і адной з самых ўплывовых партыяў краіны БНФ, АДС ужо не зьяўляецца прадстаўніком усёй ці нават пераважнай часткі апазыцыі. Асноўныя партыі, якія засталіся ў АДС – АГП і ПКБ, даволі моцна адрозьніваюцца па сваіх ідэалягічных пазыцыях. У шырокай кааліцыі , ў якую уваходзілі амаль усе асноўныя апазыцыйныя сілы, гэта ня мела вырашальнага значэньня, цяпер, калі адзінства ўсё роўна няма, гэта можа стаць істотным. Да таго ж ПКБ дэманструе выразны ўхіл у бок Расеі, яе лідэр Сяргей Калякін выступіў за прызнаньне Беларусьсю незалежнасьці Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі і нават выказваўся аб пажаданасьці перадачы Расеі ўкраінскага Крыму. Гледзячы па ўсім, ПКБ разьлічвае стаць асноўным партнэрам Расеі ў Беларусі, па меншай меры ў апазыцыйным лягеры. На гэта ж скіраваная і зьмена назвы партыі – на апошнім з'ездзе ПКБ была перайменаваная ў  Беларускую партыю аб’яднаных левых “Справядлівы сьвет”.

**БХД і БНБ: новыя твары ці старыя ў новым аблічны?**

Адной з найбольш цікавых зьяваў беларускай апазыцыйнай палітыкі апошняга часу стала зьяўленьне БХД. Яе арганізатары, хаця і параўнальна маладыя людзі, не навічкі ў палітыцы, адзін з лідэраў партыі Павал Севярынец заявіў пра сябе як лідэр моладзевых акцыяў пратэсту яшчэ ў 1996 годзе, працяглы час ён быў кіраўніком “Маладога Фронту”. Партыя вызначаецца выразнай ідэалягічнай кансэрватыўна-рэлігійнай скіраванасьцю.

Некаторыя лічаць яе клерыкальнай, некаторыя заявы і акцыі БХД выклікалі крытыку як дзяржаўных СМІ, гэтак і калег па апазыцыі. Партыя выступае супраць абортаў, за "хрысьціянізацыю беларусаў", некаторыя кіраўнікі партыі крытычна выказваюцца адносна сэксуальных меншасьцяў і міжэтнічных шлюбаў.

Таксама новай, але значна больш цікавай і важнай падзеяй зьяўляецца ўтварэньне БНБ. Схільныя да радыкальных дзеяньняў актывісты БНФ, БХД і "Маладога Фронту", ня маючы аўтарытэтнага і папулярнага ўласнага лідэра, пагадзіліся пайсьці на альянс з памяркоўным, але даволі папулярным Аляксандрам Мілінкевічам, больш схільным да перамоваў і кампрамісаў. І адных і іншых аб'ядноўвае культурна-этнічная мадэль нацыебудаваньня, якую яны падзяляюць, аднак розная стылістыка палітычнага дзеяньня можа стаць прычынай расколу гэтай кааліцыі. Аднак пакуль яна выглядае ўстойлівай і яе зьяўленьне стала каталізатарам ідэалягічнага вызначэньня іншых апазыцыйных сілаў.

**Агульныя інтарэсы і прычыны расколаў**

Агульны інтарэс ва ўсіх апазыцыйных партыяў безумоўна існуе – гэта дэмантаж аўтарытарнага рэжыму, атрыманьне магчымасьці нармальнай, свабоднай палітычнай дзейнасьці. Аднак няўдачы многіх гадоў, а таксама той факт, што нават эканамічны крызыс ня выклікаў у грамадзтве колькі-небудзь значнага росту пратэстных настрояў, усё больш схіляў апазыцыйных лідэраў да думкі, што гэтая супольная мэта недасягальная ў агляднай будучыні. Апошняй праявай супольных дзеяньняў былі прэзыдэнцкія выбары 2006 году, на якіх адзіны апазыцыйны кандыдат Мілінкевіч атрымаў 6% галасоў паводле афіцыйных дадзеных, і 18% - паводле дадзеных незалежных сацыялягічных цэнтраў.

Але калі супольная мэта лічыцца недасягальнай, то кожны з лідэраў можа спадзявацца атрымаць больш (ці хаця б нешта), ідучы ўласным шляхам. Асабістыя амбіцыі тут адыгрываюць важную, але другасную ролю. Калі супольная мэта на думку ўсіх недасягальная і пры адзінстве, то на першы плян выходзяць іншыя мэты, якім адзінства нават перашкаджае.

Да таго ж варта адзначыць, што новая палітыка Эўропы адносна Беларусі і пэўнае расчараваньне Захаду ў выніках „каляровых" рэвалюцыяў на постсавецкай прасторы істотна зьнізіла імпэт заходніх партнэраў беларускай апазыцыі заклікаць яе да адзінства любой цаной. Беларускія апазыцыянэры да парадаў сваіх замежных партнэраў неабыякавыя, але калі гэтыя парады ня надта настойлівыя, то іх можна ігнараваць, што апазыцыя з посьпехам і робіць.

Апроч асабістых амбіцыяў прычынай падзелу апазыцыі зьяўляюцца і ідэалягічныя супярэчнасьці паміж рознымі яе групамі, рознае бачаньні імі будучыні Беларусі. На мой погляд , у аснове гэтых супярэчнасьцяў ляжаць розныя мадэлі нацыебудаўніцтва, сілы, аб'яднаныя ў БНБ, падзяляюць культурна-этнічную мадэль, АГП і ПКБ – грамадзянскую мадэль.

На мой погляд гэтая адрозьненьне зьяўляецца базавым, іншыя – вытворныя ад яго. Сілы, аб'яднаныя ў БНБ, так выразна выступаюць за беларускую мову і культуру таму, што для іх гэта – аснова нацыянальнай ідэнтычнасьці, іх перасьцярогі перад расейскім уплывам тлумачацца тым, што гэты уплыў разглядаецца апроч іншага (ці ня ў першую чаргу), як пагроза гэтай ідэнтычнасьці, акрэсьленая праэўрапейская пазыцыя БНБ таксама заснаваная на ўяўленьні пра культурную чужасьць і культурную пагрозу з боку Расеі.

ПКБ і асабліва АГП таксама выступаюць за зблізжэньне з Эўропай, за акцэптацыю Беларусьсю эўрапейскіх каштоўнасьцяў. Але яны не разглядаюць Расею як іманэнтную пагрозу нацыянальнаму існаваньню Беларусі.

**Еўропа пачынае размову з Мінскам**

Новая палітыка Эўропы адносна Беларусі стала для беларускай апазыцыі сапраўдным шокам і момантам ісьціны. Пасьля страты месца у нацыянальнай сыстэмнай палітыцы напрыканцы 90-х гадоў уплыў на заходнія інстытуцыі ў сытуацыі жорсткага палітычнага супрацьстаяньня паміж Захадам і афіцыйным Менскам сталі для апазыцыі хіба не галоўным палітычным рэсурсам. Гэта прывяло на пэўнага скажэньня мэтаў і прыярытэтаў у апазыцыйнай палітыцы: надзвычайная ўвага надавалася непрызнаньню тых ці іншых дзяржаўных інстытуцыяў Беларусі на Захадзе і змаганьню за гэтае непрызнаньне і ізаляцыю афіцыйнага Менску.

Калі Эўропа, палічыўшы гэтую палітыку бясплённай як для яе ўласных мэтаў, так і ў сэнсе зьменаў у Беларусі, пачала дыялёг з афіцыйным Менскам, у беларускай апазыцыі абрынуўся сьвет. Хіба не адзін Аляксандар Мілінкевіч прыйшоў да высновы, што Эўропа не адступіць ад гэтай новай палітыкі і што ўмовай палітычнага выжываньня зьяўляецца яе падтрымка, а не супрацьстаяньне ёй. Гэтае ягоная разуменьне стала адным з асноўных чыньнікаў ягонага вяртаньня на першыя ролі.

Калі немагчымасьць зьмяніць новую палітыку Эўропы стала відавочнай усім, апазыцыя паспрабавала дамагчыся сваёй асобнай ролі ў дыялёгу паміж Эўропай і афіцыйным Менскам. Але паколькі дыялёг перайшоў са сфэры ідэалягічнай у плашчыню практычнай палітыкі, апазыцыя магла заняць гэтая месца ў адпаведнасьці зь яе рэальнай палітычнай вагой у беларускім грамадзтве. А паколькі гэтая вага досыць сьціплая, то і месца за сталом перамоваў аказалася адпаведным.

Парадокс палягае ў тым, што партыі, якія найбольш рашуча апаніруюць новай эўрапейскай палітыцы, маюць найменш рэсурсаў і схільнасьці да жорсткага пазасыстэмнага супрацьстаяньня беларускай уладзе. Невыпадкова, што ў апошнім больш менш свабодна абраным парлямэнце – Вярхоўным Савеце 13-скліканьня, апазыцыя складалася з дэпутатаў ад АГП і ПКБ. У той жа час арганізацыі, якія ў найбольшай ступені маюць досьвед вулічнай, маніфэстацыйнай барацьбы (БНФ, БХД, "Малады Фронт"), пайшлі на альянс с Мілінкевічам, палітычная лінія якога палягае ў падтрымцы новай палітыкі Эўропы і ў пэўным паразуменьні з беларускай уладай, прынамсі, ў пытаньні абароны беларускай незалежнасьці.

Тым ня менш на мой погляд канцэптуальнага адказу на выклік новай эўрапейскай палітыкі адносна Беларусі апазыцыя пакуль не знайшла. Мілінкевіч, дзякуючы свайму рашэньню не змагацца з гэтай палітыкай, а падтрымаць яе, здолеў вярнуцца з цені на авансцэну і знайсьці саюзьнікаў, здольных кампэнсаваць арганізацыйную слабасьць яго ўласнага Руху "За Свабоду". Выразны праэўрапейскі ўхіл БНБ, магчыма, дазволіць блёку заняць месца ідэалягічнай альтэрнатывы ўладзе, якая прытрымліваецца палітыкі балянсаваньня паміж Усходам і Захадам.

Аднак вельмі імаверна, што БНБ стане спаррынг-альтэрнатывай уладзе: па-першае, таму, што прадстаўляе далёка ня ўсе апазыцыйныя сілы, а, па-другое, з прычыны сваёй прыхільнасьці культурна-этнічнай вэрсіі нацыебудаўніцтва. Апошні чыньнік пакідае для БНБ месца ў своеасаблівым электаральным гета.

**Невядомая апазіцыя**

Самай вялікай хібай беларускай апазыцыі зьяўляецца яе непапулярнасьць у грамадзтве. Сама апазыцыя тлумачыць гэта адсутнасьцю доступу да масавых мэдыяў, шматгадовай паклёпніцкай кампаніяй супраць яе ў дзяржаўных СМІ, прамымі рэпрэсіямі і перасьледам, а таксама татальным страхам насельніцтва. Часткова з гэтымі тлумачэньнямі можна пагадзіцца, аднак яны не мяняюць сутнасьці высновы наконт непапулярнасьці. Яе можна

праілюстраваць наступнымі дадзенымі апытаньняў, праведзеных Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледваньняў (НІСЭПД).

**Табліца 1.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне "Ці давяраеце Вы наступным дзяржаўным і грамадзкім інстытутам" (апытаньне чэрвень 2009 году) і дынаміка індэксаў даверу *

| **Інстытуцыя** | **Давяраю (%)** | **Не давяраю (%)** | **Індэкс 06'08** | **Індэкс 06'09** |
|---|---|---|---|---|
| Праваслаўная царква | 60.6 | 21.4 | 0.43 | 0.40 |
| Армія | 53.4 | 30.5 | 0.22 | 0.24 |
| Прэзыдэнт | 50.6 | 35.3 | 0.08 | 0.15 |
| Незалежныя дасьледныя цэнтры | 45.0 | 31.6 | 0.23 | 0.14 |
| Урад | 49.3 | 36.4 | 0.07 | 0.13 |
| Суды | 47.9 | 36.9 | 0.04 | 0.11 |
| Незалежныя СМІ | 45.3 | 35.5 | 0.14 | 0.10 |
| Адвакатура | 45.5 | 37.1 | 0.03 | 0.09 |
| Дзяржаўныя дасьледныя цэнтры | 43.0 | 35.1 | 0.05 | 0.08 |
| Пракуратура | 43.5 | 40.8 | –0.04 | 0.03 |
| Дзяржаўныя СМІ | 44.7 | 42.1 | 0.05 | 0.03 |
| Нацыянальны сход | 37.0 | 41.1 | –0.12 | –0.04 |
| Міжнародныя арганізацыі (ААН, Эўразьвяз, АБСЭ і інш.) | 38.1 | 36.4 | 0.08 | 0.02 |
| КДБ | 41.3 | 39.9 | –0.03 | 0.01 |
| Праваабарончыя арганізацыі | 35.0 | 34.1 | 0.06 | 0.01 |
| Аб'яднаньні прадпрымальнікаў | 37.3 | 38.5 | –0.04 | –0.01 |
| Цэнтральная выбарчая камісія | 41.5 | 43.7 | –0.03 | –0.02 |
| Міліцыя | 42.1 | 46.3 | –0.09 | –0.04 |
| Каталіцкая царкава | 32.2 | 39.4 | –0.01 | –0.07 |
| Свабодныя і незалежныя прафсаюзы | 32.2 | 40.6 | –0.05 | –0.09 |
| Прафсаюзы, якія ўваходзяць у ФПБ | 29.7 | 44.8 | –0.13 | –0.16 |
| Мясцовыя выканаўчыя камітэты | 35.4 | 52.3 | –0.18 | –0.17 |
| Мясцовыя Советы | 35.4 | 52.4 | –0.15 | –0.17 |
| Праўладныя палітычныя партыі | 28.5 | 45.7 | –0.28 | –0.18 |
| Апазыцыйныя палітычныя партыі | 19.0 | 53.7 | –0.40 | –0.36 |
| Пратэстанцкая царква | 12.3 | 58.0 | –0.32 | –0.47 |

** Індэкс даверу – вынік дзяленьне розьніцы паміж станоўчымі і адмоўнымі адказамі на агульную колькасьць адказаў*

**<u>Табліца 2</u>.** Калі б заўтра адбыліся выбары прэзыдэнта Беларусі, за каго б Вы прагаласавалі? *(адкрытае пытаньне)*

| Варыянт адказу | 11'06 | 09'07 | 03'08 | 06'08 | 09'08 | 10'08 | 12'08 | 03'09 | 06'09 | 09'09 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| А. Лукашенка | 49.7 | 44.9 | 42.5 | 38.9 | 42.5 | 40.6 | 40.2 | 39.2 | 40.9 | 39.4 |
| А. Казулін | 3.5 | 3.2 | 5.2 | 4.8 | 5.2 | 2.9 | 5.0 | 2.3 | 2.4 | 2.0 |
| А. Мілінкевіч | 10.3 | 12.3 | 8.8 | 6.4 | 6.2 | 2.9 | 3.6 | 4.4 | 3.1 | 3.4 |
| С. Гайдукевіч | 1.8 | 1.3 | 0.5 | 2.0 | 1.7 | 1.6 | 0.7 | 0.5 | 0.6 | 0.6 |
| А. Лябедзька | 0.2 | 0.3 | 0.3 | 0.1 | 0.2 | 0.4 | 0.3 | 0.3 | 0.4 | 0.4 |
| С. Калякін | 0.1 | 0 | 0.3 | 0.2 | 0.1 | 0.1 | 0.1 | 0.1 | 0.2 | 0.4 |

З Табліцы 1 вынікае, што апазыцыя – адзін з самых непапулярных інстытутаў грамадзтва, яна менш папулярная, чым іншыя альтэрнатыўныя грамадзкія інстытуцыі, такія, як незалежныя дасьледныя цэнтры, незалежныя СМІ, праваабарончыя арганізацыі і іншыя.

Далёка не ўсе, хто знаходзіцца ў апазыцыі да ўлады, а такія не складаюць большасьці, маюць сымпатыі і давер да апазыцыі. Кансалідацыі ўсіх апанэнтаў улады, якія існуюць у грамадзтве, не адбывалася нават падчас мабілізацыйнай сытуацыі прэзыдэнцкіх выбараў. Што да гэтай сытуацыі, то Табліца 2 дэманструе велізарны разрыў паміж папулярнасьцю самых вядомых і уплывовых апазыцыйных палітыкаў і папулярнасьцю дзейнага кіраўніка дзяржавы.

Варта адзначыць, што гэта сытуацыя не зьмянілася і ў 2009 годзе, калі Беларусь сутыкнулася з вострым эканамічным крызысам. Меркавалася, што крызыс прывядзе да падзеньня ўзроўню жыцьця, гэта – да росту пратэстных настрояў і адпаведна да папулярнасьці апазыцыі. Але крызыс хутчэй паглыбіў атамізацыю грамадзтва, узмацніў яго абыякавасьць да высокіх ідэяў апазыцыі.

Што тычыцца папулярнасьці ідэалягічных установак БНБ, то на першы погляд тэндэнцыі ў грамадзкай думцы хутчэй спрыяюць ім.

**Табліца 3.** Калі б Вам давялося выбіраць паміж аб'яднаньнем з Расеяй і уступленьнем у Эўрапейскі Зьвяз, што б Вы выбралі?

| Варыянт адказу | 09'05 | 04'06 | 12'07 | 03'08 | 06'08 | 09'08 | 10'08 | 12'08 | 03'09 | 06'09 | 09'09 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Аб'яднаньне з Расеяй | 59.2 | 56.1 | 47.5 | 45.3 | 50.3 | 54.0 | 48.1 | 46.0 | 42.4 | 42.1 | 38.3 |
| Уступленьне ў Эўразьвяз | 28.6 | 31.9 | 33.3 | 33.4 | 32.4 | 26.2 | 31.1 | 30.1 | 35.1 | 41.4 | 42.7 |

З табліцы 3 бачна, што ў дыхатаміі "Расея ці Эўразьвяз" Расея пераважала да самага апошняга часу. Значны рост прыхільнікаў праэўрапейскага выбару назіраецца, пачынаючы са жніўня мінулага году, гэта значыць, з пачатку новай палітыкі Эўропы і адпаведна новай палітыкі афіцыйнага Менску адносна Эўропы, у тым ліку і інфармацыйнай. Гэтыя зьмены масавай сьвядомасьці выглядаюць пакуль кан'юнктурнымі. Больш таго, адказы на іншыя пытаньні сьведчаць пра тое, што большасьць насельніцтва зусім не падзяляе бачаньне БНБ, для якога імкненьне ў Эўропу азначае "прэч ад Расеі". У верасьнёўскім 2009 году апытаньні НІСЭПД амаль 80% апытаных адзначылі, што ня лічаць Расею замежжам (!), і нават сярод тых, хто гатовы галасаваць за кандыдата ад дэмакратычнай апазыцыі, 42% аддалі перавагу таму, хто "палепшыў бы адносіны Беларусі ў роўнай ступені і з Эўропай, і з Расеяй", а толькі 14% - таму, хто "палепшыў бы адносіны Беларусі з Эўропай".

З гэтых дадзеных, на мой погляд, вынікае, што апазыцыя не ўяўляе сабой рэальнай альтэрнатывы дзейнай уладзе і пакуль не бачная пэрспэктыва, калі яна зможа яе ўяўляць.

**Выбары і спадзяваньні апазыцыі**

У гэтай сытуацыі натуральна, што апазыцыі ўскладае свае надзеі на наступныя выбары: у весну 2010 адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы, напачатку 2011 году – прэзыдэнцкія, у 2012 годзе парлямэнцкія выбары. Апазыцыя хацела б вярнуцца ў сыстэмную, рэальную палітыку, паколькі новая палітыка Эўропы ўжо не дазваляе ёй займаць месца адзіных партнэраў Эўропы ў Беларусі. Больш таго, вельмі рэальная магчымасьць, што заходнія партнэры апазыцыі пачнуць ацэньваць апазыцыю і асобныя яе часткі ў адпаведнасьці зь іх рэальнай палітычнай вагой і ўплывам, адным з галоўных паказчыкаў якіх зьяўляецца прысутнасьць ва ўладзе.

Але існуе замкнёнае кола – для росту папулярнасьці і моцы апазыцыі патрэбныя свабодныя ўмовы дзейнасьці, доступ да дзяржаўных СМІ, месцы ў прадстаўнічых органах улады. Але дамагчыся ўсяго гэтага ва ўмовах аўтарытарнага беларускага рэжыму можна толькі пры дапамозе моцы і папулярнасьці. Спадзевы на тое, што гэтых умоваў дапаможацца ад рэжыму Захад – "пугай" да жніўня 2008 году, "пернікам" пасьля жніўня 2008 году, аказаліся ня надта апраўданымі. Рэжым можа пайсьці на пэўныя палёгкі і паслабленьні, але ён ня пойдзе на свабодныя выбары. Як адзначыў беларускі палітоляг Аляксей Пікулік, крах рэжыму – гэта не перамога апазыцыі на свабодных выбарах, гэта – ўжо самі свабодныя выбары.

У сувязі з гэтым нават адносны посьпех апазыцыі на мясцовых і ў 2012 годзе – парлямэнцкіх выбарах, можа стаць вынікам ня столькі удалых выбарчых кампаніяў, колькі зьдзелак паміж Эўропай і рэжымам, а таксама паміж апазыцыяй, ці асобнымі апазыцыйнымі сіламі і апазыцыянэрамі, і рэжымам. Гэтыя зьдзелкі могуць мець ускосны характар, быць зьдзелкамі па змаўчаньні, могуць быць і прамымі дамоўленасьцямі. У прыватнасьці, пазыцыя Мілінкевіча і ягоных прыхільнікаў адносна новай палітыкі Эўропы можа быць прапановай такой зьдзелкі і нават яе часткай.

Матывам для беларускай улады пайсьці на яе можа быць нежаданьне страціць магчымасьці, якія патэнцыйна адкрывае перад ёй новая палітыка Эўропы і чаканьне новых эўрапейскіх "пернікаў". Якой колькасьцю дэпутацкіх мандатаў яна гатовая "заплаціць" за гэта вызначыць apriori немагчыма, гэта зьяўляецца прадметам гандлю.

На прэзыдэнцкіх выбарах апазыцыя, калі разглядаць сытуацыю паводле трэнду, ня мае абсалютна ніякіх шанцаў на посьпех. Удзел у іх можа ставіць на мэце толькі маніфэстацыю альтэрнатывы і пераканфігурацыю апазыцыйнага палітычнага поля.

Разуменьне таго, што шанцаў на посьпех на прэзыдэнцкіх выбарах 2011 году няма нават пры адзінстве апазыцыі, дасьць той вынік, што гэта адзінства і ня будзе, выбары для апазыцыі стануць своеасаблівай "ярманкай нявестаў". Да таго ж, гледзячы па ўсім, замежныя партнэры апазыцыі ня будуць надта настойліва гэтага адзінства дамагацца.

**Праеўрапейскасць становіцца прывабнай**

Пакуль новая палітыка Эўропы не прынесла апазыцыі асаблівых дывідэндаў. Узровень рэпрэсіяў калі паменшыўся, то нязначна, зьнікненьне адных формаў гэтых рэпрэсій

суправаджалася зьяўленьнем новых. Не пашырыліся і легальныя магчымасьці ўплыву апазыцыі. Магчыма, што ранейшае ўяўленьне апазыцыі пра сябе, як пра “альтэрнатыўнае МЗС”, было ў значнай меры неадэкватным і да жніўня 2008 году, але потым відавочная страта гэтага статусу выклікала канцэптуальны шок, які не пераадолены дагэтуль.

І ўсе ж выглядае, што ў доўгатэрміновым пэрыядзе зьмена палітыкі Эўропы можа пайсьці апазыцыі на карысьць.

Самастрымліваньне рэжыму з прычыны нежаданьня згубіць магчымасьці, якія дае дыялёг з Эўропай, можа прадухіліць рэзкае ўзмацненьне рэпрэсіяў і нават адкрыць шлях для зьдзелак наконт месцаў для апазыцыі ў прадстаўнічых органах улады.

Страта апазыцыяй статусу палітыкаў, чые “выбаршчыкі” знаходзяцца ў Вашынгтоне, Брусэлі, Бэрліне і Варшаве, можа прывесьці да зьмены прыярытэтаў, да імкненьня заваёўваць падтрымку беларускіх выбаршчыкаў.

Нарэшце, той праэўрапейскі трэнд у масавай сьвядомасьці, які абазначыўся пасьля пачатку новай эўрапейскай палітыкі, ў пэрспэктывы адкрывае для праэўрапейскі ў цэлым арыентаванай апазыцыі новыя магчымасьці.

*Юрый Дракахруст*

**Юрый Дракахруст**. Нарадзіўся ў Хабараўску ў 1960 годзе. Скончыў механіка-матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсытэту. Кандыдат фізіка-матэматычных навук. Працаваў у Інстытутах матэматыкі і эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук РБ, у Незалежным інстытуце сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледваньняў. Адзін з заснавальнікаў Беларускага Народнага Фронту. 1991-2000 - карэспандэт рускай службы Радыё Свабода па Беларусі, 1996 - 2000 - супрацоўнік менскага бюро Беларускай службы Радыё Свабода. З 2000 па цяперашні час - супрацоўнік праскай рэдакцыі Беларускай службы Радыё Свабода